393–472]. Цікава, што споведзь ніжэйшых чыноў магла адбывацца на месцы нясення службы [2, арк. 175].

Афармленне міжканфесіянальных пераходаў (чацвёртая падсістэма канфесіянальнай дакументацыі) мела ўласцівасці, якія тычыліся неабходнасці навучання і хрышчэння іўдзеяў і мусульман. Пры гэтым, калі далучаўся непаўналетні, то тэрмін навучання складаў не менш 6 месяцаў [2, арк. 17]. Прадстаўнікі інаслаўных веравызнанняў не мелі перашкодаў пры далучэнні да праваслаўя. Іх спісы або паведамленні, калі змена канфесінальнай прыналежнасці не насіла масавы характар, перадаваліся ў кансісторыю, як пра раскольніка Галактыёна Філіпенка [2, арк. 999–1000].

Судовыя справы (пятая падсістэма канфесіянальнай дакументацыі) аб скасаванні шлюбу і накладанні епітымій разглядаліся Полацкай духоўнай кансісторыяй, аднак іх вынікі афармленыя копіяй указа накіроўваліся у мэтах кантролю выканання прысуду настаяцелю сабора, калі абвінавачаны быў яго прыхаджанінам. Напрыклад, пры Лепельскім саборы з 1863 г. выконваў сямігадовую епітым'ю за блуд унтэр-афіцэр ніжэгародскага рэзервовага палка Дзмітрый Яўсеенка [2, арк. 529].

Такім чынам, захаванасць архіва Лепельскага Свята-Праабражэнскага сабора за 1861–1864 гг. дазваляе ацаніць як аб'ём, так і склад дакументаабароту ніжэйшай адміністрацыйна-тэрытарыяльнай адзінкі праваслаўя – царквы. У азначаны перыяд у саборы штогадова фарміравалася каля 25 спраў, што адносіліся да агульнай і канфесіянальнай сістэм справаводнай дакументацыі. У архіў не трапіла пратакольная дакументацыя (агульная справаводная дакументацыя) і ўліковая дакументацыя (прыхода-расходныя кнігі), што маглі быць не завершаны справаводствам на момант перадачы спраў, метрычныя кнігі аб народжаных, шлюбаваных і памерлых. Захаваны комплекс дакументаў сведчыць пра адказнае стаўленне настаяцеля сабора да дакладнага дакументавання сваёй дзейнасці, агульныя падыходы ў афармленні дакументаў на ўсіх ступенях іерархіі царквы, а таксама пра ўзаемадзеянне духавенства з органамі дзяржаўнага і канфесіянальнага кіраўніцтва, прыватнымі асобамі, ролю царквы на грамадска-палітычнай арэне Лепельшчыны 1860-х гг.


1. Нацыянальны гістарычны архіў Беларусі (НГАБ). – Ф. 2301. Воп. 1. Спр. 34.
2. НГАБ. – Ф. 2531. Воп. 1. Спр. 41.
3. НГАБ. – Ф. 2576. Воп. 1.
4. НГАБ. – Ф. 2476. Воп. 1. Спр. 38.
5. Рыбчонак, С. А. Крыніцы па генеалогіі Беларусі XVI – пачатку XX ст. : Метадыч. парады / С. А. Рыбчонак. – Мінск : БелНДІДАС, 2003. – 76 с.
6. Сементовский, А. М. Витебск и уездные города Витебской губернии : с тринадцатью политипажами в тексте и портретом архиепископа Полоцкого и Витебского Василия / А. М. Сементовский. – Санкт-Петербург : Тип. К. Вульфа, 1864. – 136 с.


**Сыцько К.В.**

## ДАКУМЕНТЫ ПАРАФІЯЛЬНЫХ АРХІВАЎ РЫМСКА-КАТАЛІЦКАГА КАСЦЁЛА НА БЕЛАРУСІ ЯК КРЫНІЦА ПА МІКРАГІСТОРЫІ

З развіццём айчыннай гістарычнай навукі і паступовым паглыбленнем ведаў па гісторыі Беларусі, тым не менш, застаюцца г. зв. "белыя плямы" выкліканыя вялікімі стратамі дакументальных помнікаў за, напрыклад, часамі Вялікай Айчыннай вайны. У гэтым кантэксце актуалізуюцца пытанні пошуку і ўвядзення раней невядомых гістарычных крыніц у навуковы абарот.

Адным з такіх відаў крыніц з'яўляюцца дакументы, якія ствараліся ў дзейнасці парафіяльных і філіяльных культавых устаноў Рымска-каталіцкага Касцёла на Беларусі ў XVIII–XX стст. і захоўваюцца ў парафіях на дадзены момант. Дадзеныя дакументакомплексы, нажаль, з'яўляюцца маладаследаваным бокам айчыннага крыніцазнаўства, аб чым сведчыць дастаткова нешматлікая колькасць апублікаваных спарадычных артыкулаў па вызначанай праблематыцы (гл. напрыклад: [8], [10]).

Разам з тым нельга не адзначыць важнасць і высокую крыніцазнаўчую вартасць дадзеных матэрыялаў перадусім, як крыніц па гісторыі невялікіх гарадоў, мястэчак, вёсак і г. д., то бок, па-факту – крыніц мікрагістарычнага характару.

Улічваючы тэзісны характар дадзенага артыкула, аўтар лічыць неабходным раскрыць абазначанае вышэй палажэнне на прыкладзе найбольш захаваных комплексаў матэрыялаў з касцё-



Репозиторий ВГУ

лаў Найсвяцейшай Тройцы ў в. Ішчална, Уздвіжання Святога Крыжа ў г. Ліда (Фарны), Святой Тэрэзы Авільскай у г. Шчучын. Кожны з дадзеных комплексаў уяўляе сабой сукупнасць крыніц са 150–200 адзінак захавання, датычных выключна гісторыі парафіі.

Найбольш прадстаўленымі ў колькасных адносінах дакументамі абазначаных архіваў з'яўляюцца матэрыялы, адносныя асобы (*метрычныя бруліёны,парафіяльныя метрычныя кнігі, усемагчымыя спісы вернікаў, спісы святарства, спісы брацтваў і г.д. – К.С.*) і крыніцы зямельна-гаспадарчага ўліку (*парафіяльныя асобнікі інвентароў і візітаў, апісанні парафій і дэканатаў і г.д. – К.С.*). Пры гэтым, у параўнанні з дакументамі, якія захоўваюцца ў дзяржаўных архівах Беларусі, мы можам казаць аб унікальнасці большасці дакументальных помнікаў з касцельных збораў (аўтар лічыць неабходным называць кансісторскі асобнік інвентару, метрыкі і г. д., якія апынуліся на захаванні ў дзяржаўных архівах пасля 1919 г. і парафіяльныя асобнікі, якія часцей за ўсё знаходзяцца на дадзены момант у парафіі, рознымі тыпамі крыніц аднаго віду).

Пры першасным аглядзе памянёных гістарычных крыніц адразу становіцца заўважнай некаторая ўнутранная ўзаемнасувязь кожнага дакумента з іншымі ў комплексе – так, розныя блокі інфармацыі ў вялікай ступені паўтараюцца ў розных відах дакументаў адной і той жа культавай установы, змяняецца толькі форма запісу. Напрыклад, капулятыўная метрыка Ішчальнскай парафіі за 1712–1797 гг. [2] утрымлівае геаграфічны блок, які дазваляе нам адсачыць межы парафіі, колькасць вёсак, фальваркаў і засценкаў; колькасць вернікаў па кожнай лакацыі, рухі насельніцтва; стыхійныя бедствы і эпідэміі, якія здарыліся ў парафіяльных вёсках і г. д. У сваю чаргу, гэты ж матэрыял мы можам пабачыць у шматлікіх парафіяльных асобніках інвентароў і візітаў, а таксама ў парафіяльнай хроніцы [3]. Такія ж уласцівасці назіраюцца і ў іншых парафіях. Памянёныя дакументы даюць карысныя звесткі аб паўсядзённых з'явах невялікіх населеных пунктаў Беларусі, антрапаніміцы, зямельна-гаспадарчых адносінах і г. д.

Пры гэтым нельга не адзначыць, што паўтаральнасць інфармацыйных блокаў з'яўляецца не простай кампіляцыяй гістарычных і сацыяльнагаспадарчых фактаў, але рэмінісцэнтным прайграваннем найбольш важнай інфармацыі аб парафіяльным жыцці. Пры гэтым, такія рэмінісцэнцыі могуць указваць на фактычную запаволенасць паўсядзённага жыцця, адсутнасць (ці нежаданне) з боку рэлігійнай грамады прымаць пэўныя змены што выліваецца ў паўторы фактаў за нейменнем іншых.

Карысным бокам такога рэмінісцэнтнага прайгравання інфарматыўных блокаў гістарычных крыніц з'яўляецца магчымасць кампаратыўнага, то бок комплекснага разгляду фактаў з парафіяльнага жыцця, некаторая генералізацыя дробных падзей гістарычнай рэальнасці.

Наступным, не менш цікавым за парафіяльныя асобнікі метрык і інвентароў, масівам крыніц з парафіяльных архіваў па праблеме, можна назваць добра захаваныя і дастаткова прадстаўленыя ў памянёным комплексе эгадакументы, да якіх адносяцца ўсе матэрыялы з яўна выражанай персаніфікацыяй фактаў. Напрыклад, шмат інфармацыі аб міжваенным жыцці ў Лідскім павеце даюць мемуары кс. Гіппаліта Баярунца "Запісы аб Крыжы і капліцы ў Цвірмах", у якіх аўтар распавядае аб цяжкасцях і праблемах жыцця ў Лідзе ў 20–30-я гг. XX ст., міжканфесійных зносінах, пабудове новых культавых будынкаў і г. д. Крыніцай па гісторыі пасляваеннага жыцця можна назваць мемуары кс. Станіслава Каласанты-Роека, які распавядае аб ціску на рыма-каталікоў у Лідзе ў пасляваенны перыяд, замахах на яго жыццё і г. д. Разам з тым, улічваючы прафесійныя асаблівасці асоб, якія дадзеныя крыніцы стварылі, варта ставіцца да дадзеных дакументаў крытычна. Так, напрыклад, кс. Г. Баярунец пісаў аб тым, што габрэі недобразычліва да яго адносіліся, спрабуючы рабіць усялякія перашкоды да дзейнасці Касцёла і ўласна кс. Баярунца на Лідчыне [11, арк. 65], што, у сваю чаргу не пацвярджаецца ніводнай іншай гістарычнай крыніцай.

Вялікую ролю ў асвятленні жыцця дэканатаў і парафій адыгрывае добра захаваная ў касцельных архівах карэспандэнцыя, якую можна падзяліць на дзве часткі – паміж парафіяльнымі святарамі ў межах дэканата і паміж святарамі (ці, у савецкі час – таварыствам вернікаў) і органамі дзяржаўнай улады. Першая частка асвятляе ў асноўным парадак набажэнстваў, размеркаванне абавязкаў па філіяльных капліцах, пераход парафіі з аднаго дэканата ў іншы, вызначэнне граніц парафій і г.д. Другая частка дае ўяўленні аб адносінах паміж дзяржавай і мясцовымі групамі вернікаў. Напрыклад, адметнай з'яўляецца перапіска вернікаў г. Шчучын з мясцовым гарвыканкамам і аблвыканкамам на прадмет вяртання канфіскаванага ў 1960 г. будынка касцёла Святой Тэрэзы Авільскай – цяжкая папяровая валакіта, якая расцягнулася на

Рэпазіторый ВГУ

28 год (*касцёл павярнулі ў 1988 г. пасля звароту да М. С. Гарбачова – К.С.*) [4], яскрава паказвае ролю і значэнне рэлігійных інстытуцый у заходнебеларускім горадзе за Савецкім часам. У сваю чаргу, перапіска Лідскага Фарнага касцёла закранае куды больш цяжкія моманты жыцця рыма-каталіцкага духавенства ў БССР, а менавіта – ціск і некаторае абмежаванне гэтай сацыяльнай групы ў правах (забарону праводзіць набажэнствы ў 1966–1970 гг., канфіскацыю ў пробашча прыватнага гарода памерам 0,15 га і г. д.) [6].

Яшчэ адным відам крыніц, якія прадстаўлены ў парафіяльных архівах, з'яўляюцца мапы і планы мясцовасцей, могілак, прыкасцельных тэрыторый і г. д. З дапамогай дадзеных крыніц можна прасачыць, напрыклад, тапаніміку вёсак (*так, месца, дзе стаяла плябанія магло перарасці ў вёску, засценак, калонію з назваю Плябанаўцы – К.С.*). Напрыклад, цікавым з'яўляецца план мястэчка Шчучын за 1719 г. з абазначэннем найбольш важных для вернікаў месцаў [5, арк. 199], мапа парафіі Ішчальнскай за 1880 г. [1, арк. 24–25], мапа дзялення горада Ліда па парафіях у 1936 г. з указаннем капліц і могілак [7, арк. 14] і г.д.

Нарэшце, апошнім відам менавіта мікрагістарычных крыніц, якія сустракаюцца ў парафіяльных архівах, аўтар можа назваць касцельныя летапісы і хронікі XX ст., якія раскрываюць нетаропкае, размеранае жыццё тэрыторыі, на якой кампактна пражываюць вернікі, з пункту гледжання менавіта духоўных зносін унутры парафіі. Яскравым прыкладам падобнай крыніцы з'яўляецца Ішчалнская касцельная хроніка за 1515–2002 гг. Пры гэтым важным момантам такіх хронік можна лічыць апісанне традыцыйных заняткаў мясцовага насельніцтва. Так, у той жа Ішчалнскай хроніцы адзначаецца, што мясцовыя жыхары традыцыйна займаліся вобжыгам цэглы і гашэннем вапны, што адрознівала іх ад жыхароў сумежных парафій [3, арк. 17]. Такую ж цікавасць уяўляе і Шчучынская парафіяльная хроніка за 1493–1891 гг., прадстаўленая ў копіі, створанай у 1910–1917 гг. [5].

Як можна пабачыць, кожны выдзелены від крыніц з'яўляецца іманентным у адносінах да пэўнай тэрыторыі, амаль не раскрываючы знешніх яе сувязяў, што яўна ўказвае на мікрагістарычны характар.

Разам з тым бачыцца адна з найбольш небяспечных уласцівасцей даследаванняў на базе мікрагістарычных крыніц, а менавіта штучная дыскрэтнасць гістарычнай рэальнасці, якая заключаецца ў бачнай на першы погляд адсутнасці сувязяў парафіяльнага жыцця з працэсамі больш высокага ўзроўня. У такім выпадку адзіным магчымым выхадам аўтар можа прапанаваць комплекснае вывучэнне крыніц па гісторыі Рымска-каталіцкіх парафій на Беларусі ў звязку з крыніцамі ўстаноў больш высокага ўзроўню – дыяцэзаў, кансісторый, курый і г. д., што дае магчымасці да пазбягання разрываў як вертыкальных (іерархічных), гэтак і гарызантальных (паміж парафіямі) сувязяў унутры інстытуцыі, а таксама захаваць сувязі паміж інстытуцыяй і вернікамі, якія ў яе ўваходзяць.

Такі падыход дае айчыннай гістарычнай навуцы больш, чым звычайны імпульс да пераасэнсавання чалавечага вопыта і некаторага пераасэнсавання гістарычнай навукі ў бок "дробнага", паўсядзённага вопыта, а менавіта дазваляе прымяніць метад, як пісаў Х. Меддык, "па той бок канцэпцыі макрагістарычнай сінтэзуючай гісторыі" [9, с. 196], то бок стварыць паўнавартасную, арганічную карціну гістарычнай рэальнасці.

Такім чынам, можна казаць аб тым, што крыніцы парафіяльных архіваў з'яўляюцца каштоўнай базай ведаў па гісторыі невялікіх населенных пунктаў – гарадоў, мястэчак, засценкаў, калоній, фальваркаў і г. д., аднак выкарыстоўвацца дадзеныя дакументы павінныя толькі ў звязку з іншымі матэрыяламі па гісторыі Рымска-каталіцкага Касцёла на Беларусі.

1. Архіў касцёла Найсвяцейшай Тройцы ў в. Ішчална – Спр. б/н Переписка о костельном имуществе, 1880 – 1888 гг.
2. Архіў касцёла Найсвяцейшай Тройцы ў в. Ішчална. – Спр. б/н Chrzest i szluby, 1713 – 1796 гг.
3. Архіў касцёла Найсвяцейшай Тройцы в. Ішчална. – Спр. б/н. Kronika Kościelna, 1936 г.
4. Архіў касцёла Святой Тэрэзы Авільскай г. Шчучын. – Спр. б/н. Дакументы за савецкі перыяд у россыпу, 1960 – 1991 гг.
5. Архіў касцёла Святой Тэрэзы Авільскай г. Шчучын. – Спр. б/н. Kronika parafjalna Szczyczyńskiego Kościoła, 1917 г.
6. Архіў касцёла Уздвіжання Святога Крыжа г. Ліда – Спр. б/н Дакументы за савецкі перыяд у россыпу, 1951 – 1989 гг.
7. Архіў касцёла Уздвіжання Святога Крыжа г. Ліда – Спр. б/н Мапы, схемы, планы ў россыпу, 1931 – 1939 гг.
8. Лісейчыкаў, Дз.В. Сенсацыйная знаходка ў мурах Вішнеўскага касцёла / Дз.В. Лісейчыкаў // Архивы и делопроизводство. – 2015. – № 5. – С. 67–71.
9. Меддик, Х. Микроистория / Х. Меддик // THESIS. – Вып. 4. – С. 193–202.
10. Сыцько, К. В. Архівы рыма-каталіцкіх парафій Заходняй Беларусі XIX – першай паловы XX ст. (на прыкладзе архіва касцёла Найсвяцейшай Троіцы ў в. Ішчална) / К. В. Сыцько // Теоретические и практические проблемы документоведения и архивоведения: ретроспектива и современность : материалы междунар. науч.-практ. конф., Минск, 2–3 декабря 2015 г. / БЕЛНИИДАД ; редкол.: Э. М. Савицкий, С. В. Жумарь, П. А. Левчик [и др.]. – Минск, 2016. – С. 173–181.
11. Bojarunets, H. Zapisy o Krzyży i Kaplicy w Cwiermah / H. Bojarunets. – Lida: з дакументаў Лідскага Фарнага касцёла Узвышэння Святога Крыжа, 1936. – 50 с.



Репозиторий БГУ